# НЕКАТОРЫЯ АКТУАЛЬНЫЯ ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ ГІСТОРЫКА-ПРАВАВОЙ НАВУКІ БЕЛАРУСІ

**І. А. Саракавік**

Агульнавядома, што метадалогія даследчыка істотна ўплывае на раскрыццё сутнасці той ці іншай з'явы, падзеі, тэндэнцый і заканамернасцей станаўлення і развіцця дзяржавы і права таго ці іншага народа, у тым ліку і беларускага. Аднак гэта не азначае, што ўсе вучоныя павінны карыстацца і карыстаюцца адной і той жа метадалогіяй. У такім выпадку не было б і развіцця навукі. Яна ў значнай ступені рухаецца наперад, дзякуючы таму, што даследчыкі адносяць сябе да розных навуковых школ і плыняў, у аснове якіх, як правіла, розны светапогляд. Таму не дзіва, што на сёння ў гісторыка-прававой навуцы назбіралася нямала спрэчных пытанняў, нягледзячы на тое, што папярэднікамі, асабліва шаноўным І. А. Юхо, шмат што было закладзена ў падмурак і сам будынак гэтай навукі.

Гэтыя пытанні тым больш становяцца актуальнымі ў сувязі з тым, што ў апошнія гады з'яўляецца шэраг прац, найперш выдадзеных у Расіі, у якіх «абгрунтоўваецца» «новае» бачанне некаторымі даследчыкамі гісторыі ўсходніх славян. Назва адной з іх непасрэдна гаворыць сама за сябе: «Киевской Руси не было, или Что скрывают историки». Яе аўтар – А. А. Кунгураў. На яго погляд, этнонімы «украінец», «беларус» з'явіліся толькі ў XIX ст., а афіцыйна прызнаны толькі ў 20-х гг. XX ст. Гісторыя ведае толькі адзін усходнеславянскі этнас – рускі. Таму «першым крокам у гэтым кірунку павінна стаць кансалідацыя рускага народа (сучасных рускага, украінскага і беларускага), раней усе яны называліся рускім народам» [10, с. 37, 38]. Па ім, атрымліваецца, калі адзін этнас, то і адна тэрыторыя, і назва яе «Расійская», з выцякаючымі наступствамі. Усё б нічога, каб гэта была толькі ўласная думка. Аднак кніга ў 416 старонак, выдадзеная масавым тыражом, мае грамадскае гучанне і распаўсюджваецца на тэрыторыі нашай дзяржавы. Таму і выклікае адпаведныя рэакцыі. Такі погляд не адзінкавы. Справа, вядома, не столькі ў этнасах, колькі ў тэрыторыі, якую яны займаюць, яе геаграфічным становішчы.

А ці сапраўды на аснове славянскіх плямён сфарміраваўся адзіны «старажытнарускі народ», з якога, як з калыскі, выйшлі беларускі, украінскі і рускі народы? Дыскусія на гэты конт працягваецца з некаторымі перапынкамі больш чым стагоддзе. І адзінага пункту гледжання не будзе да таго часу, пакуль пры разглядзе пытання не адыйдзе ў нябыт пэўны стэрэатып вялікадзяржаўнага падыходу аб «старажытнарускай народнасці», не ўзнікне падзелу на «вялікія» і «малыя» народы.

Не менш важнае для гісторыка-прававой навукі і пытанне выкарыстання ў пэўны гістарычны перыяд тэрмінаў «Беларусь», «беларус». У

савецкі час гісторыі была выдадзена пяцітомная энцыклапедыя «Гісторыя Беларускай ССР», якая ахоплівае перыяд ад «першабытнаабшчыннага ладу на тэрыторыі Беларусі» да «перыяду завяршэння пабудовы сацыялізму і паступовага пераходу да камунізму» [2]. Зразумела, што «тэрыторыі Беларусі» ў час «першабытнаабшчыннага ладу» не існавала і не магло існаваць. У некаторых дапаможніках па гісторыі дзяржавы і права Беларусі, нават дапушчаных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў юрыдычных і гістарычных спецыяльнасцей вышэйшых навучальных устаноў, такі падыход таксама мае месца (напрыклад, станаўленне права Старажытнай Беларусі і яго характарыстыка і інш.) [1]. Зразумела пазіцыя паважанага і аўтарытэтнага аўтара – паказаць развіццё на нашых землях як дзяржаўнасці, так і права, з даўніх часоў. Аднак тады ў пісьмовых крыніцах сучасная беларуская тырыторыя не мела назву «Беларусь». Ні дзяржавы з такой назвай, ні «беларускага народа» ў той перыяд не існавала. Але такое становішча не ўмаляе нашай сапраўды шматвяковай гісторыі. Большасць назваў сучасных дзяржаў свету і іх народаў першапачаткова былі іншымі.

Адносна сучаснай тэрыторыі нашай краіны дзяржаўна-палітычная назва «Беларусь» з’явілася толькі ў XX ст. у сувязі з абвяшчэннем Беларускай Народнай Рэспублікі, а затым Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь, а ў навуковай літаратуры, палітычнай і прававой думцы – ў другой палове XIX ст. Здаецца, гэта ўсім зразумела, але чамусьці некаторыя аўтары па-ранейшаму пішуць «Беларусь у старажытнасці», «Беларусь у перыяд феадалізму», «Беларусь у перыяд капіталізму», ці «Беларусь у складзе Вялікага княства Літоўскага», «Беларусь у складзе Рэчы Паспалітай» і г. д. Калі нам неабходна паказаць сувязь цяперашняй нашай дзяржавы з даўнімі часамі, то правамерна пісаць «Сучасная беларуская тэрыторыя ў старажытнасці» ці «Сучасная тэрыторыя Беларусі ў перыяд капіталізму» (па аналогіі і іншыя перыяды).

Больш складанае пытанне з ужываннем тэрміна «*беларус*». Наконт гэтага таксама не існуе адзінага погляду. У адрозненне ад некаторых іншых этнасаў нашы продкі мелі на працягу сваёй гісторыі розныя этнонімы, што прывяло да іх наслаення, а таму і пэўнай размытасці, іх асэнсавання і «прымеркай» да сябе карэнным насельніцтвам. Не выпадкова, што ў канцы XIX ст. яны, каб іх не залічвалі ні да палякаў, ні да рускіх, разумеючы сваю самабытнасць і згодна са сваёй самасвядомасцю, называлі сябе пры земскім перапісу 1897 г. «*тутэйшымі*».

Першапачаткова, як вядома з часоў летапісаў, нашых продкаў называлі *крывічамі*, *дрыгавічамі*, *радзімічамі*. Затым на ўсходзе сучаснай Беларусі з’явіўся тэрмін «*русін*» (да XIV ст. значную частку насельніцтва Полацкага і Віцебскага княстваў называлі «*беларусцамі*». Напэўна, не выпадкова пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай Кацярына II гэту тэрыторыю назвала

«Беларускім генерал-губернатарствам»). У заходняй частцы нашых зямель гэты тэрмін не быў пашыраны. І ні ў адным летапісе няма выразу «старажытнарускі народ» ці «старажытнаруская народнасць», хоць летапісы пісаліся не па «гарачых» слядах гісторыі, а праз дзесяцігоддзі і стагоддзі.

Аднак з другой паловы XIII і асабліва ў XIV ст. пашыраецца этнонім «*літва*», што звязана з назвай племені «літва» летапіснай тэрыторыі «Літва», у падаўляючай большасці размешчанай на тэрыторыі сучаснай Беларусі, з працэсам утварэння і развіцця ВКЛ, адным з галоўных удзельнікаў якога быў наш этнас [5, с. 27; 16; 13, с. 639 і інш.]. Паўла Урбан даказвае, што «літва» – гэта славянскі народ [15, с. 15], іншыя даследчыкі не такія катэгарычныя, значная частка з іх, услед за А. К. Краўцэвічам [9], схільна да славяна-балцкага сінтэзу. Тым не менш, суіснаванне этноніма «літва» і політноніма «Літва» на працягу стагоддзяў прывяло да таго, што народы і іншых рэгіёнаў з цягам часу стаў сябе называць *літвінамі* (характэрна, што ў час савецкага перапісу насельніцтва 1926 г. многія смаляне называлі сябе літвінамі). А самаідэнтыфікацыя ў аснове прыналежнасці асобы да таго ці іншага этнасу важней за любыя навуковыя канцэпцыі. І менавіта гэта даследчыкі ў першую чаргу павінны ўлічваць у сваіх працах. Этнонімы «французы» ці «англічане» першапачаткова не распаўсюджваліся на ўсе тыя тэрыторыі, якія сёння называем «Францыя» ці «Англія» і жыхары якіх самаідэнтыфікуюць сябе «французамі» ці «англічанамі».

У сувязі з дзейнасцю народнікаў (пазней – сацыял-дэмакратаў), выхадцаў з Паўночна-Заходняга краю, якія вучыліся ва ўніверсітэтах Расіі (Віленскі ўніверсітэт у 1832 г. быў ліквідаваны царызмам) і ўспрынялі ідэалогію рускіх народнікаў, афіцыйную рускую гістарыяграфію, паступова пачынае выкарыстоўвацца тэрмін «*беларус*», асабліва ва ўсходняй частцы сучаснай Беларусі. Зразумеўшы памылку папярэднікаў, В. Ластоўскі на пачатку XX ст., на мой погляд, з палітычных меркаванняў, прапанаваў называць наш народ «*крывічамі*», а край – «*Крывіяй*», каб тым самым нават па назве нельга было правесці паралелі з тэрмінамі «Расія», «рускі». Больш за тое, тэрміны «Летува», «летувіс» у канцы XIX – пачатку XX ст. былі перахоплены, іх пачалі актыўна ўжываць нашы суседзі на паўночным захадзе. Спроба беларускіх кіраўнікоў нацыянальна-вызваленчага руху ў пачатку XX ст. узгадніць з літоўцамі неабходнасць прыняць канцэпцыю гістарычнай Літвы (Беларусі і Літвы) правалілася, і яны прадоўжылі выкарыстоўваць тэрміны «беларус», «Беларусь».

Гісторыю не перапішаш. Але яе патрэбна ведаць, каб ганарыцца мінулым і не дапускаць памылак сёння. Таму, падаецца, неабходна ўжываць тыя этнонімы нашых продкаў, якія існавалі на кожным гістарычным адрэзку. Тады мы лепш асэнсуем адметнасці нашай нацыі і этнічнай самасвядомасці сучаснага беларуса, складанасці і асаблівасці фарміравання і развіцця дзяржавы і права Беларусі [Гл.: 12].

Ніякавата гучыць і выраз «старажытнае права (дзяржава) у IX – першай палове XIII ст.». Аднак вядома, што «старажытны перыяд» нашай гісторыі завяршаецца ў V ст. Такі агульнаеўрапейскі падыход. Ён прыняты і нашымі блізкімі суседзямі і ўжо стаў прымяняцца і многімі нашымі даследчыкамі, але не стаў прынятым ва ўсіх ВНУ краіны.

Цяжка пагадзіцца і з выразам «старажытнаруская дзяржава Кіеўская Русь» і «старажытнаруская народнасць». У дарэвалюцыйнай рускай, а затым савецкай, гістарыяграфіі сцвярджалася, што ў старажытнасці існавала толькі старажытнаруская дзяржава – Кіеўская Русь, якая з'яўлялася гістарычнай калыскай рускага, украінскага і беларускага народаў. Такога меркавання прытрымліваліся прадстаўнікі пецярбургскай (прыдворнай) школы даследчыкаў. Яго падтрымлівалі і многія беларускія савецкія вучоныя. Некаторыя пагаджаюцца з гэтым і цяпер [11, с. 28, 33–34].

У адрозненне ад прыхільнікаў такога падыходу прадстаўнікі маскоўскай гісторыка-прававой школы на чале з В. В. Ключэўскім лічылі, што Кіеўская Русь «не была дзяржавай рускага народа, таму што яшчэ не існавала самога гэтага народа: да паловы XI ст. былі гатовы толькі этнаграфічныя элементы, з якіх потым доўгім і цяжкім працэсам складваецца руская народнасць». На думку В. В. Ключэўскага, у перыяд Кіеўскай Русі існавалі самастойныя дзяржавы-княствы [8, с. 163].

К. Маркс пісаў пра Кіеўскую Русь, што гэта была наспех арганізаваная дзяржава, «скараспелая імперыя, састаўленая Рурыкавічамі са шматкоў, таксама як іншыя імперыі аналагічнага паходжання». Ён параўноўваў імперыю Рурыкавічаў з імперыяй Карла Вялікага, называў іх «варварскімі дзяржавамі», распад якіх прывёў да з'яўлення на карце Еўропы «новых народаў» [7, с. 76–77].

Некаторыя рускія, савецкія гісторыкі больш асцярожна, не так катэгарычна выказвалі думкі наконт Кіеўскай Русі. Так, акадэмік Б. Рыбакоў адзначаў, што зліццё зямель былых племянных саюзаў у адзіную старажытнарускую народнасць не было поўным і канчатковым. А. М. Нечкіна і П. Лейбенгруб у школьным падручніку па гісторыі СССР ужо не сцвярджалі, што старажытнаруская дзяржава з'яўлялася гістарычнай калыскай рускага, украінскага і беларускага народаў.

Доктар гістарычных навук, прафесар Г. В. Штыхаў лічыць, што існавала Кіеўская дзяржава, а не старажытнаруская і яна з'яўлялася федэрацыяй, а Полацкае княства на пэўным этапе развіцця выступала як частка гэтай федэрацыі. Ён сцвярджае, што аб дзяржаўнасці на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў часы Кіеўскай Русі можна гаварыць адназначна. У 980 г. у Полацку самастойна княжыў Рагвалод. Яго выключнае становішча сярод іншых князёў летапісец падкрэсліў словамі: «Трымаў Полацкую зямлю і валодаў ёю і княжыў у ёй». Г. Штыхаў адзначае: «У XI ст. Полацкая зямля сфарміравалася як моцная дзяржава ва Усходняй Еўропе. Полацк быў

стольным горадам гэтага буйнога княства, якое мела сваю княскую дынастыю, моцнае войска, даволі развітую гаспадарку і значныя дасягненні ў галіне культуры» [18, с. 32].

Больш катэгарычная пазіцыя М. І. Ермаловіча. На яго думку, з канца X ст. Полацкае княства не ўваходзіла ў склад Кіеўскай дзяржавы. Гэта было самастойнае дзяржаўнае ўтварэнне. Ён спасылаецца на гісторыка Полацкай зямлі Л. Аляксеева, які сцвярджаў, што *Полацкая зямля была адной з самых самастойных адзінак Старажытнай Русі* [6, с. 53–84].

Т. І. Доўнар у сваім вучэбным выданні па гісторыі дзяржавы і права Беларусі, не ўключаючыся ў гэту дыскусію, але, спасылаючыся на выказванні М. А. Дзьяканава і В. І. Сергеевіча, засведчыла сваю прыхільнасць наконт існавання ў раннім сярэднявеччы дзяржаў-княстваў, а не адзінай дзяржавы [4, с. 16].

Аналіз літаратуры па гэтым пытанні, знаёмства з умовамі жыццядзейнасці нашых далёкіх продкаў дазваляюць прыйсці да наступных высноў. Па-першае, у перыяд Кіеўскага княства не існавала «старажытнарускай народнасці». На гэты час існавалі славяне, якія яшчэ да сярэдзіны XII ст. мелі назвы племянных саюзаў: драўляне ўпамінаюцца да 1136 г., дрыгавічы – да 1149 г., крывічы – да 1162 г., радзімічы – да 1169 г. [17, с. 36]. Этнагенез сучасных беларусаў, украінцаў, рускіх паказвае, што яны сфарміраваліся толькі ў сярэдзіне II тысячагоддзя. Значыць, у раннім сярэднявеччы «старажытнаруская народнасць» не існавала і існаваць не магла, не скláліся адпаведныя сацыяльна-эканамічныя і дзяржаўна-палітычныя ўмовы. Можна лічыць правільным меркаванне В. В. Ключэўскага.

Па-другое, не існавала ў той час і «старажытнарускай дзяржавы». Была спроба кіеўскіх князёў трымаць пад сваім кантролем тэрыторыю ўсходніх славян, спаганяць з іх даніну, разам ажыццяўляць набегі на непакорных і ворагаў. Адным з іх удавалася гэта лепш, другім – горш.

Справа ў тым, што Кіеўскае княства ў разглядаемы час вылучалася сярод іншых. Гэта было выклікана найперш лепшымі ўмовамі для жыццядзейнасці: спрыяльны клімат, лесастэп, выгаднае размяшчэнне на шляху «з вараг у грэкі», а самае галоўнае – урадлівыя чарназёмы, асноўнае багацце для развіцця земляробства і жывёлагадоўлі. Таму апошняе і прыцягвала сюды славян, рабіла гэты рэгіён адным з багацейшых ва ўсходніх славян. Менавіта перш за ўсё з-за багацця і значнасці гэтага рэгіёна тут была пасада Вялікага князя, які адрозніваўся ад іншых.

Аднак пры ўсім сваім багацці нават Кіеўскае княства не мела дастатковых матэрыяльна-фінансавых магчымасцей утрымліваць такую колькасць дружыннікаў, якія б маглі трымаць у падпарадкаванні вялізныя тэрыторыі ўсходніх славян. Тым не менш, яго дружына з-за гэтых умоў, а таксама шматлікіх набегаў качавых плямён і была, бадай, самай магутнай і

мабільнай сярод іншых княстваў усходніх славян. Гэта, да слова, і дазваляла Кіеўскаму княству мець большы ўплыў.

Трэба мець на ўвазе і тое, што ў аснове дзяржаў-княстваў была натуральная гаспадарка, што не падштурхоўвала да аб'яднання. Вёска і горад былі разрознены. Гаспадарчая разрозненасць не спрыяла фарміраванню адзінай дзяржавы. Больш за тое, не існавала добрых шляхоў зносін, ды і транспартныя сродкі не былі мабільнымі. Не склаліся адзіныя вытворчыя адносіны паміж усімі рэгіёнамі ўсходніх славян. Яны закранулі, і то ў невялікай ступені, лакальныя рэгіёны. На гэта ўплывала і невялікая шчыльнасць насельніцтва. Патрэбен быў час для развіцця такіх вытворчых сіл і вытворчых адносін, якія аб'ектыўна прыводзілі б да неабходнасці ўтварэння адзінай дзяржавы. Нават у больш позні часы ВКЛ ўдзельныя княствы, княствы-анексы мелі вялікую аўтаномію, перш за ўсё, з-за адсутнасці цесных гаспадарчых і палітычных сувязяў паміж рознымі рэгіёнамі краіны. Што ж гаварыць пра IX–XII стст.? Таму ўлада Кіеўскага князя распаўсюджвалася на іншыя княствы-дзяржавы, як правіла, толькі на час знаходжання яго дружыны ў тым ці іншым княстве. Нават пастаўленыя ім намеснікі-родзічы не маглі змяніць становішча.

Маскоўскае княства многія сучасныя рускія даследчыкі разглядаюць як спадчынніка Кіеўскага княства, не маючы для гэтага ніякіх падстаў. У чым тут справа? Стаўшы моцнай рускай цэнтралізаванай дзяржавай, а затым імперыяй, Расія не магла абыйсціся без шматвяковай гісторыі, і яе афіцыйныя даследчыкі пачалі «выпраўляць» памылкі гісторыі. З часоў Кацярыны II пачалася выпраўка летапісаў дзеля таго, каб паказаць і даказаць права Расіі на іншыя землі, у тым ліку на літвінскія (беларускія), права на пераемнасць улады ад Кіева. Дзеля гэтага выкарыстоўвалася і так званая «рэлігійная карта». У сувязі з гэтым ва Указе Кацярыны II ад 4 снежня 1783 г., па сведчанні В. О. Ключэўскага, адзначалася: «Назначить до 10 человек, которые совокупными трудами составили бы полезные записки о древней истории, преимущественно же касающихся России <...> по известному довольно своеобразному плану». Справа, такім чынам, тычылася новай гістарычнай дактрыны Расійскай імперыі, згодна з якой павінны былі быць выпраўлены, адрэгаваны на яе карысць ранейшыя першакрыніцы. Аднак яшчэ да гэтага часу А. І. Лызлоў напісаў кнігу «Скифская история», якая была выдадзена ў 1776 і 1787 гг. У ёй аўтар прыйшоў да высновы, што Кіеўская Русь і Масковія – дзве розныя дзяржавы з рознымі этнасамі [Цыт. па: 3, с. 301].

І тут як не ўзгадаць нашага знакамітага даследчыка Мікалая Мікалаевіча Улашчыка, які зрабіў шмат карыснага на ніве «ажыўлення» беларускіх летапісаў. Менавіта ён падрыхтаваў да друку два тамы беларускіх летапісаў для «Поўнага збору рускіх летапісаў». Ён навучаў, што перш чым

выкарыстоўваць тыя ці іншыя летапісы, неабходна высветліць, адкуль (з якіх сховішчаў) атрыманы надрукаваныя крыніцы, зыходзячы з якіх патрабаванняў адбываўся адбор дакументаў для друку, якіх правілаў друкавання прытрымліваўся рэдактар, як адбывалася археаграфічная апрацоўка і г. д. [14, с. 128].

Важнае тэарэтыка-метадалагічнае значэнне для нашай гісторыка-прававой навукі мае асэнсаванне і даследаванне дзяржаўнасці і права ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Т. І. Доўнар у згаданым вучэбным выданні выдзеліла спецыяльны раздзел «Беларуская ССР у перыяд Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенныя гады», у якім разглядае становішча БССР у ваенны перыяд, яе органы ўлады і кіравання, узнаўленне дзейнасці дзяржаўнага апарату, развіццё права БССР у пасляваенны перыяд, міждзяржаўную дзейнасць Беларусі, а таксама акупацыйны рэжым [4, с. 245–262].

А. Ф. Вішнеўскім ў вучэбным дапаможніку па гісторыі дзяржавы і права таксама напісаны спецыяльны раздзел па гэтым перыядзе – «Дзяржава і права Беларускай ССР у гады Вялікай Айчыннай вайны». Ён называе тры аспекты: прававыя меры павышэння абароназдольнасці краіны напярэдадні і ў час Вялікай Айчыннай вайны, вышэйшыя органы дзяржаўнай улады і кіравання і права ў гады вайны, аднак, наогул, не разглядае пытанняў органаў ўлады, адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу, права на акупіраванай тэрыторыі [1, с. 242–256].

В. А. Круталевіч і І. А. Юхо ў вучэбным дапаможніку «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917–1945 гг.)» у главе II «Беларуская ССР падчас другой сусветнай вайны (1939–1945)» не абыходзяць гэта пытанне, але фашысцкі акупацыйны рэжым разглядаюць схематычна, ў асноўным у агульнагістарычным плане.

Агляд раздзелаў па трох працах прыводзіць да высновы, што на акупіраванай беларускай тэрыторыі быццам дзейнічалі толькі дзяржаўнасць і права Беларускай ССР. На самай справе, зразумела, далёка не так. Рэальнае становішча было больш складаным. Праўда, Т. І. Доўнар прысвяціла ў сваім раздзеле 3,5 старонкі акупацыйнаму рэжыму. Няма сумнення ў тым, што аўтары добра разумеюць становішча таго часу. Але, напэўна, наш стэрэатып таго, што прадметам разгляду з’яўляецца менавіта дзяржава і права Беларусі, то, як быццам, няма месца дзяржаўнасці і праву акупацыйных органаў улады і кіравання ў 1941–1944 гг. Але ў гады Вялікай Айчыннай вайны больш за ўсё па часу на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі дзяржаўныя (акупацыйныя) органы ўлады і кіравання фашысцкай Германіі. Менавіта і яе права рэгулявала адносіны ў грамадстве і на беларускай тэрыторыі.

Таму мэтазгодна, на мой погляд, разглядаць раздзел пад назвай «Дзяржаўнасць і права на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны».

Тут знойдзецца месца асаблівасцям развіцця дзяржавы і права ў гады вайны на савецкай аснове (органы ўлады і кіравання БССР у савецкім тыле, прававое рэгуляванне дзейнасці савецкага партызанскага і падпольнага руху, адметнасці дзейнасці партызанскіх судоў, прававое забеспячэнне аднаўлення народнай гаспадаркі і жыццядзейнасці на вызваленай ад фашыстаў тэрыторыі). Дзеля таго, каб найбольш поўна раскрыць фашысцкі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі, першапачаткова мэтазгодна раскрыць планы кіраўніцтва Трэцяга рэйха адносна Беларусі да пачатку вайны на аснове яго нарматыўных актаў і патлумачыць іх змену за першыя тры яе месяцы. Затым можна астанавіцца на адметнасцях адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу тэрыторыі Беларусі, органах улады і кіравання, уключаючы і фарміраванні калабарацыі, прававое рэгуляванне розных сфер жыццядзейнасці насельніцтва на акупіраванай тэрыторыі, адносіны фашыстаў да Гаагскай і Жэнеўскай канвенцый наконт партызанскай барацьбы і адносіны акупацыйных улад да ваеннапалонных.

Думаецца, такі падыход дасць больш поўнае ўяўленне аб дзяржаўна-прававым становішчы Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Нельга не прызнаць вялізную метадалагічную ролю і значэнне тэрміналогіі ў гісторыка-прававой літаратуры, у якой існаваўшая (існуючая) рэальнасць можа быць як аб'ектыўна адлюстраваная, так і скажоная. Апошняе часта выкарыстоўваецца тымі ці іншымі палітычнымі коламі розных краін дзеля дасягнення сваіх інтарэсаў, прыцягваючы пэўных «вучоных» для абслугоўвання сваіх міфаў. У той жа час існуе пэўны светапогляд на пытанні гісторыка-прававой навукі саміх даследчыкаў. І да гэтага, на мой погляд, неабходна паважліва адносіцца. Адна справа выконваць нейчы «заказ», іншая – уласная пазіцыя.

### Літаратура

1. *Вішнеўскі, А. Ф.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / А. Ф. Вішнеўскі. – Мінск, 2000. – 319 с.

2. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. – Т. 1: Першабытнаабшчынны лад на тэрыторыі Беларусі. Эпоха феадалізму / рэдкал.: К. І. Шабуня (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1972. – 632 с.

3. *Голденков, М.* Утраченная Русь: забытая Литва, неизвестная Московия, запрещенная Беларусь / М. Голденков. – Минск, 2009. – 416 с.

4. *Доўнар, Т. І.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэб. выданне / Т. І. Доўнар. – Мінск, 2007. – 400 с.

5. *Ермаловіч, М.* Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае / М. Ермаловіч. – Мінск, 2000. – 448 с.

6. *Ермаловіч, М.* Старажытная Беларусь: Полацкі і Новагародскі перыяды / М. Ермаловіч. – Мінск, 2001. – 366 с.

7. К. Маркс, Ф. Энгельс Соч. / Т. 15. – М., 1986.

8. *Ключевский, В. О.* Курс русской истории / В. О. Ключевский // Соч.: в 8 т. Т. 1. – М., 1956. – 428 с.

9. *Краўцэвіч, А. К.* Стварэнне Вялікага княства Літоўскага / А. К. Краўцэвіч. – Жэшаў, 2000. – 238 с.

10. *Кунгуров, А. А.* Киевской Руси не было, или Что скрывают историки / А. А. Кунгуров. – М., 2010. – 416 с.

11. *Новик, Е. К.* История Беларуси. С древнейших времен до 2008 г.: учеб. пособие / Е. К. Новик, И. Л. Качалов, Н. Е. Новик; под ред. Е. К. Новика. – Минск, 2010. – 526 с.

12. *Саракавік, І.* Адметнасці фарміравання беларускай нацыі / І. Саракавік // Гістарычна-археалагічны зборнік. Вып. 25. – Мінск, 2010. – С. 60–65.

13. *Станкевіч, Я.* Гістарычныя творы / Я. Станкевіч. – Менск, 2003. – 776 с.

14. *Улашчык, М.* Выбранае / М. Улашчык. – Мінск, 2001. – 608 с.

15. *Урбан, П.* Старажытныя ліцьвіны: мова, паходжанне, этнічная прыналежнасць / П. Урбан. – Мінск, 2001. – 216 с.

16. *Чаропка, В.* Гісторыя нашага імя / В. Чаропка // ЛіМ. – 1993. – 26 чэрв. – 2 ліп.

17. *Штыхаў, Г. В.* Народнасць, якую прыдумалі гісторыкі / Г. В. Штыхаў // Бел. мінуўшчына. – 1997. – № 1. – С. 35–38.

18. *Штыхаў, Г. В.* Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі / Г. В. Штыхаў. – Минск, 1999. – 94 с.